

**Турызм ёсць, брэндаў не хапае**

СТАР. 3



**Мужчына заўсёды жадае і заўсёды гатовы?**

СТАР. 5



**Тры рублі адной манетай**

СТАР. 6

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

25 ЧЭРВЕНЯ 2014 г. СЕРАДА № 117 (27727) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## СУХІ ПОРАХ ПЛЮС МАДЭРНІЗАЦЫЯ

### Краіне патрэбна мабільная армія з эфектыўным узбраеннем

**Аб гэтым кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка заявіў, наведваючы ў Барысаве прадпрыемствы абароннага сектара. Прэзідэнту, у прыватнасці, было далажана аб арганізацыі вытворчасці ў Беларусі шматмэтавага поўнапрываднага аўтамабіля, які можа абсталёўвацца рознымі модулямі і перавозіць да 12 чалавек, паведамляе БЕЛТА.**



Фота БЕЛТА.

На думку кіраўніка дзяржавы, у сучасных умовах «мабільная тэхніка важнейшая, чым танкі, самалёты і іншае». «Нам патрэбны гэтыя мабільныя шматмэтавыя машыны, каб мы маглі ў любы час паехаць куды трэба і нанесці непапраўную шкоду таму, хто сюды палезе. Трэба паскорыцца», — паставіў задачу беларускі лідар.

Як далажылі Прэзідэнту, плануецца, што лакалізацыя пры вытворчасці адпаведнай тэхнікі будзе дасягаць 85%. Акрамя таго, у гэтым годзе ў Беларусі таксама адкрыецца прадпрыемства па вытворчасці ўласных гранатамётаў.

Аляксандр Лукашэнка ў час наведвання ў Барысаве ААТ «140-ы рамонтны завод» таксама паставіў задачу стварыць айчынную бронемашыну. «Вы павінны прыдумаць самую сучасную бранятэхніку для сучаснага бою. Якую, вы ведаеце лепш за мяне: у вас ёсць уласны і вы вывучаеце сусветны вопыт. У бліжэйшы час вы павінны зрабіць гэтую машыну, за якой стаялі б у чарзе людзі, гатовыя купіць яе за мяжой», — сказаў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ў сучасным свеце не менш запатрабаваны і паслугі па рамонце і мадэрнізацыі markaga узбраення.

Прэзідэнт станоўча ацаніў і той факт, што, акрамя патрэб абароннага сектара, прадпрыемства таксама выконвае работы для сферы народнай гаспадаркі: рамантуе і мадэрнізуе чыгуначную тэхніку, дызельныя рухавікі, вырабляе ўсюдыходную, аварыйна-выратавальную і спецыяльную пажарную тэхніку. «Усё трэба рабіць, што вы можаце і за што плацяць грошы. Так паступаюць ва ўсім свеце», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

У час наведвання завода па рамонце радыёэлектроннага ўзбраення Прэзідэнту было далажана аб арганізацыйна-вытворчай структуры, фінансава-гаспадарчай дзейнасці і перспектывах развіцця завода, а таксама аб рабоце, якую праводзяць па стварэнні беларускага зенітнага ракетнага комплексу. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што, акрамя рамонту і мадэрнізацыі тэхнікі, адпаведныя прадпрыемствы павінны паступова падыходзіць да стварэння новых сучасных узораў узбраення. «На гэтай базе трэба стварыць свой комплекс, і ён павінен быць не горш за С-300. Таму вы думайце, якая ў яго будзе ракета. Галоўнае, каб яна была эфектыўнай і паражала любую цэль. Усе заводы пачыналі калісьці з рамонту, потым займаліся мадэрнізацыяй, а потым выходзілі на ўласныя ўзоры», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. «Ваша задача — атрымаць тут новую сучасную зброю для нашай абароны і для рэалізацыі на экспарт», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Што тычыцца айчыннага зенітна-ракетнага комплексу, Аляксандр Лукашэнка паставіў задачу, каб гэтым пытаннем займалася не адно прадпрыемства ці нават ведамства. Адпаведная задача павінна рэалізоўвацца сумеснымі намаганнямі пры ўдзеле ўсіх зацікаўленых.

СТАР. 2

**ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

**26 чэрвеня 2014 года ў 15.00** у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 9) адбудзецца заключнае пасяджэнне чацвёртай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання.

## ЧЭРВЕНЬСКАЕ ЗБОЖЖА



Фота БЕЛТА.

*У старшага камбайнера КСУП «Малажынскі» Брагінскага раёна Івана ХАДЗЬКО і яго калег гарачая пара жніва пачалася сёлета ў чэрвені: у самым паўднёвым рэгіёне Гомельшчыны пачалі ўбіраць азімы ячмень. У «Малажынскім» ён пасеяны на 130 гектарах. Ураджай, хоць і надзвычай ранні, але неблагі: у першыя дні з кожнага гектара малоцяць у сярэднім па 37 цэнтнераў збожжа.*

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ:**

***«З пачатку года ў вобласці на вадзе загінулі пяцёра дзяцей. У пераважнай большасці няшчасныя выпадкі адбыліся ў прысутнасці бацькоў або блізкіх сваякоў. Гэта нармальныя сем'і, дарослыя знаходзіліся ў цвярозым стане, загаралі або лавілі рыбу. Складваецца адчуванне, што мы распесцілі бацькоў, якія прывыклі, што дзеці знаходзяцца пад пастаянным наглядам педагогаў, міліцыі, выратавальнікаў, медыкаў і работнікаў культуры. Бацькі проста забыліся, што дзецьмі трэба займацца. Гэта і прыводзіць да трагедый».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 25.06.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 10180,00 | ■ |
| Еўра | 13850,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 299,50 | ▲ |
| Укр. грыўня | 856,90 | ▲ |

■ Спрэчнае пытанне

## ШКОЛА НА ЗАМКУ

### За апошнія 20 гадоў на Магілёўшчыне зачынілася кожная другая сельская ўстанова адукацыі

**Дырэктар Ганчанскай школы, што на Клічаўшчыне, Зоя Мельнікава не ўтойвае: ёй нялёгка будзе прывыкнуць да таго, што той установы, якой яна аддала амаль 50 гадоў свайго жыцця, больш не будзе. Калі былыя выпускнікі пачалі ёй тэлефанаваць, каб спытацца, куды ж цяпер прыязджаць на вечары сустрэч, яна не ведала, што ім адказаць. Дамовіліся, што сустрэнуцца недзе непадалёку ад будынка. Школы там больш няма, а таму прайсціся па яе «ціхіх паверхах», як пяецца ў вядомай песні, не атрымаецца...**

### ПРАЦЭС ПАЧАЎСЯ НЕ ЎЧОРА...

Калісьці Ганчанская школа была адной з лепшых у Беларусі, яна нават занесена ў ганаровую кнігу Міністэрства адукацыі БССР. А мастацкія вырабы яе вучняў, якія займаліся ў творчым аб'яднанні пры школе, ведалі не толькі на радзіме, але і ў Маскве. У канцы мінулага стагоддзя яны выстаўляліся на вядомай Усесаюзнай выстаўцы дасягненняў народнай гаспадаркі і былі адзначаны бронзавымі медалямі. Неверагодна, але калісьці тут налічвалася да 500 вучняў. Сёлета засталося усяго...12. Не сакрэт, што калі б працавала тое торфапрадпрыемства, якое калісьці квітнела, такога б ніколі не адбылося.

Двухпавярховы мураваны будынак уражвае, нават не верыцца, што ў ім больш не загучаць дзіцячыя галасы. Але лёс яго ўжо вырашаны. Апошні званок прагучаў 31 мая адразу для ўсіх — і для школьнікаў, і для настаўнікаў. Таму слёз не хаваў ніхто.

Такі лёс напаткаў не адну толькі Ганчанскую школу. На Магілёўшчыне з 1 верасня плануецца зачыніць 18 вучэбных устаноў, у тым ліку 5 вучэбна-вытворчых камбінатаў. Пад аптымізацыю трапілі школы, дзе колькасць вучняў — меншая за 25. Нейкіх класаў там няма наогул, а ў некаторых усяго па 1-3 вучні.

Але працэс скарачэння малакамплектных школ пачаўся не ўчора. Па звестках упраўлення адукацыі аблвыканкама, за апошнія 20 гадоў толькі ў сельскай мясцовасці было зачынена больш за 250 школ, практычна кожная другая. А колькасць вучняў на Магілёўшчыне скарацілася з амаль 179 тысяч (у 1993 годзе) да 105 тысяч (у 2013-м).

СТАР. 3

■ Наша гісторыя

## ВЯРТАННЕ КНЯЗЯ

### У Віцебску, дзе напрыканцы гэтага тыдня будуць святкаваць 1040-ю гадавіну заснавання горада, адкрыюць помнік князю Альгерду

**Помнік унікальны для Віцебска і тым, што гэта будзе першая конная статуя. Яна з'явіцца ў цэнтры горада недалёка ад будынка ратушы. Некаторыя гараджане выказвалі сумненні: навошта, маўляў, увекавечваць памяць князя, які «ваяваў з рускім войскам, на Маскву хадзіў»? Мы ж з Расіяй — саюзнікі і актыўна супрацоўнічаем у рамках Саюзнай дзяржавы...**

Па каментарый карэспандэнт «Звязды» звярнуўся да **Анатоля ДУЛАВА, кандыдата гістарычных навук, дацэнта, загадчыка кафедры гісторыі Беларусі Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава.**

— Бацькам Альгерда, князя Крэўскага і Віцебскага, вялікага князя Літоўскага, быў вялікі князь літоўскі Гедымін, пры якім Вільня стала цэнтрам збірання ўсходнеславянскіх земляў.



Фота БЕЛТА.

СТАР. 2

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ЛІТВУ АБАВЯЗАЛІ ВЯРНУЦЬ ГЕРМАНІІ КАРЦІНЫ НА ПАЎМІЛЬЁНА ЕЎРА

Вярхоўны суд Літвы абавязаў улады рэспублікі вярнуць Германіі палатно італьянскага мастака Антоніа Кампі «Тры Марыі каля магілы Хрыста», якое было незаконна вывезена адтуль пасля Другой сусветнай вайны. Акрамя таго, як паведамляе DELFI, суд пацвердзіў рашэнне ніжэйшай інстанцыі, паводле якога Літва павінна перадаць Фонду прускіх культурных каштоўнасцяў палатно нямецкага жывапісца Адольфа Менцэля «Раніца папялістага дня». Кошт абедзвюх карцін, выстаўленых у Літоўскім музеі мастацтваў, паводле інфармацыі выдання, ацэньваецца ў два мільёны літаў (амаль 580 тысяч еўра). Цяжба паміж Літвой і Германіяй з нагоды гэтых палотнаў доўжылася больш за восем гадоў.

### ПУЦІН ПРАПАНАВАЎ АДМЯНІЦЬ РАШЭННЕ АБ ВЫКАРЫСТАННІ АРМІІ ВА УКРАІНЕ



Прэзідэнт Расіі прапанаваў Савету Федэрацыі адмяніць пастанову аб выкарыстанні Узброеных сіл РФ на тэрыторыі Украіны ў сувязі з пачаткам трохбаковых перамоў па пытанні ўрэгулявання сітуацыі ва ўсходніх рэгіёнах Украіны. Сваю прапанову расійскі лідар абгрунтаваў неабходнасцю нармалізацыі становішча ў рэгіёне. Пытанне аб адмене пастановы будзе разгледжана на пленарным пасяджэнні Савета Федэрацыі 25 чэрвеня. Нагадаем, 1 сакавіка члены Савета Федэрацыі дазволілі кіраўніку дзяржавы выкарыстоўваць ва Украіне войскі. Рашэнне было афармлена пастановай верхняй палаты парламента аб дачы згоды «на выкарыстанне Узброеных сіл РФ на тэрыторыі Украіны да нармалізацыі грамадска-палітычнай сітуацыі ў гэтай краіне».

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### 17 ТЫСЯЧ УКРАІНСКІХ МІЛІЦЫЯНЕРАЎ ЗВОЛЬНЕНЫ ЗА ПАРУШЭННЕ ПРЫСЯГІ

Амаль 17 тысяч міліцыянераў звольнены з МУС Украіны за парушэнне прысягі. Такія даныя прывёў намеснік кіраўніка міністэрства Сяргей Чабатар, не ўдакладніўшы, за які перыяд былі зроблены звальненні. «Мы ўсё робім для таго, каб сапраўды асобы, якія парушаюць закон, не працавалі ў МУС. Тут не можа быць з імі ніякіх кампрамісаў», — заявіў Чабатар. Намеснік міністра прывёў даныя, паводле якіх звальненні супрацоўнікаў у Хмяльніцкай, Херсонскай, Чарнігаўскай, Харкаўскай і Цярнопальскай абласцях адбыліся з-за іх дачынення да карупцыйных схем і наркагандлю. Такія кадравыя рашэнні Чабатар растлумачыў працягам рэфармавання міліцыі.

КОРАТКА

Намінальная налічаная сярэднямесячная заработная плата работнікаў Беларусі ў студзені — маі 2014 года склала Br5 млн 680,1 тыс. Сярэдняя зарплата ў маі была Br6 млн 55,9 тыс., яна павялічылася ў параўнанні з красавіком бягучага года на 3,3 працэнта, або на Br195,3 тыс.

Аграрыі ўсіх абласцей пачалі нарыхтоўку траў другім укосам. Усяго план другога ўкосу складае 868,1 тыс. га. Па стане на 24 чэрвеня заданне выканана амаль на 11,4 працэнта.

Верталёты Ка-52 і самалёты Су-34 ВПС Расіі прымуць удзел у паветраным парадзе ў азнаменаванне Дня Незалежнасці і 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, які пройдзе 3 ліпеня ў Мінску.

На цэнтралізаваным тэсціраванні па рускай і беларускай мовах 40 абітурыентаў атрымалі 100 балаў.

■ Спецыяльны рэпартаж

ФАРПОСТ СПАКОЮ. Сумесны праект газеты «Звязда» і Міністэрства ўнутраных спраў. № 2 (2)

## РЭФОРМА ВЫПРАЎЛЕННЯ

### Як калонія ператвараецца... у лячэбна-працоўны прафілакторый




Фота Надзеі БУЖАН.

**Да магілёўскай выпраўленчай калоніі №19 вядзе добра ўтрамбаваная коламі аўтамабіляў і пратэктарамі абутку дарога. Больш за 20 гадоў па ёй у выпраўленчую ўстанову везлі асуджаных, а хутка павязуць пастаяльцаў у лячэбна-працоўны прафілакторый. Напрыканцы мая Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ «Аб удасканаленні дзейнасці крымінальна-выканаўчай сістэмы Міністэрства ўнутраных спраў». Гэты дакумент даў штуршок да рэарганізацыі пэўных выпраўленчых калоній у лячэбна-працоўныя прафілакторыі.**

### «БОЛЬШАСЦЬ АСУДЖАНЫХ РАЗЛІЧВАЕ НА ДАТЭРМІНОВАЕ ВЫЗВАЛЕННЕ»

— Цяпер усё знаходзіцца ў стадыі ліквідацыі выпраўленчай калоніі, — прымае нас у працоўным кабінеце **Дзмітрый АЛЕЙНІКАЎ, выканаўца абавязкаў начальніка выпраўленчай калоніі №19.** — Для гэтага рыхтуюцца неабходныя дакументы, але працэс не такі хуткі, а таму патрабуе пэўнага часу. Большасць зняволеных мы ўжо этапавалі ў іншыя калоніі. У нас засталося каля ста асуджаных. Аднак праз пэўны час іх таксама перавядуць у іншыя месцы пазбаўлення волі. Што тычыцца нашых супрацоўнікаў, большасць з іх працягне працаваць у ЛПП.

СТАР. 6

ISSN 1990 - 763X

14117

9 771990 763008

ЗВЯЗДА. Да чытача з любоўю!

**ШАНОЎНЫЯ СЯБРЫ!**

**Вы яшчэ паспееце падпісацца на «Звязду» на ІІІ квартал 2014 года!**

**Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.**

**Падпіска, дарэчы, можа стаць добрым падарункам да свята для вашых родных і блізкіх, для вашых сяброў.**

| Індэкс/перыяд | 1 месяц | 3 месяцы |
|---|---|---|
| 63850 (для індывідуальных падпісчыкаў) | 57 000 | 171 000 |
| 63145 (для ветэранаў ВАВ і пенсіянераў) | 51 300 | 153 900 |
| 63858 (для ведамасных падпісчыкаў) | 125 000 | 375 000 |
| 63239 (ведамасная падпіска для ўстаноў міністэрстваў адукацыі, культуры і аховы здароўя) | 112 500 | 337 500 |